# КАНФЛІКТЫ Ў ГАЛІНЕ ЗНЕШНЕГАНДЛЁВАЙ ПАЛІТЫКІ

**К. А. Пашук**

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, г. Мінск;*
*katrin.pashuk@gmail.com;*
*навук. кір. – Т. А. Ястраб*

Сучасная сітуацыя ў сусветным гандлі абумоўлена выбухам гандлёвых канфліктаў паміж буйнымі эканомікамі свету. Артыкул прысвечаны разгляду такіх канфліктаў у знешнегандлёвай палітыцы, выяўленню іх ўплыву на змяненні ў знешнегандлёвай палітыцы ЕАЭС, а таксама крызісу дзеючага ў СГА механізму па ўладжванню канфліктаў. Выяўлены прыярытэтыныя напрамкі развіцця ЕАЭС ва ўмовах сучасных гандлёвых канфліктаў, а менавіта правядзенне работы па фарміраванні адзінай экспартнай стратэгіі (палітыкі) ЕАЭС, атрыманні статусу назіральніка ў СГА, а пасля далучэнне да гэтай міжнароднай арганізацыі. Выяўлена, што, каб пазбегнуць глабальнай гандлёвай вайны, неабходна хутчэй вырашаць пытанне па ўдасканаленню Органа ўладжвання спрэчак СГА і ў цэлым па рэфармаванню механізму ўладжвання канфліктаў.

***Ключавыя словы:*** знешнегандлёвая палітыка; гандлёвыя канфлікты; Еўразійскі эканамічны саюз; Сусветная гандлёвая арганізацыя; Орган уладжвання спрэчак.

Апошнім часам абвастраюцца ўнутранапалітычныя і знешнепалітычныя дзяржаўныя адносіны. Гэта характарызуецца значным павелічэннем супярэчнасцяў эканамічнага і эканоміка-палітычнага плана. Усе часцей адбываюцца гандлёвыя канфлікты, якія наносяць асноўны ўдар па фінансава-бюджэтнай сферы дзяржавы.

Сучасная сітуацыя ў сусветным гандлі абумоўлена нарастаннем пратэкцыянізму, выбухам гандлёвых войнаў паміж буйнымі эканомікамі свету, актыўнай санкцыйнай палітыкай некаторых дзяржаў. Нягледзячы на тое, што развіццё знешняга гандлю ў цэлым спрыяльна ўздзейнічае на развіццё нацыянальнай эканомікі, залежнасць ад сусветнага рынку можа выклікаць сур'ёзныя сацыяльна-эканамічныя праблемы ўнутры краіны. Таму пасля сусветнага фінансавага крызісу гандлёвыя канфлікты ўсё часцей сталі ахопліваюць краіны, якія імкнуцца максімальна субсідзіраваць нацыянальных вытворцаў або стварыць ім больш камфортныя ўмовы. Таму неабходна правесці больш дэталёвы аналіз прычын і метадаў гандлёвых канфліктаў у мэтах вызначэння адэкватных механізмаў іх спынення або мінімізацыі наступстваў для нацыянальнай і сусветнай эканомікі, разгледзець уздзеянне знешнегандлёвай палітыкі на гандлёвыя канфлікты.

Сучасная знешнегандлёвая палітыка – гэта складаная сістэма, якая фарміруецца пад уплывам нацыянальных, эканамічных і палітычных фактараў. Па асноўных напрамках знешнегандлёвай палітыкі вылучаюць

палітыку свабоднага гандлю і палітыку пратэкцыянізму. Гэтыя напрамкі адрозніваюцца па сваіх мэтах, задачах і інструментах.

Палітыка свабоднага гандлю ў чыстым выглядзе азначае, што дзяржава ўстрымліваецца ад непасрэднага ўздзеяння на знешні гандаль, пакідаючы за рынкам ролю асноўнага рэгулятара. Аднак дзяржава заключае дагаворы з іншымі краінамі, каб даць максімальную свабоду сваім гаспадарчым суб'ектам. Правядзенне палітыкі свабоднага гандлю дазваляе атрымаць найбольшую выгаду ад міжнароднага эканамічнага абмену краінам эканамічна больш развітым, хоць у чыстым выглядзе яна ніколі і нідзе не ўжывалася [3, с. 290].

Пратэкцыянізм – палітыка, якая накіравана на абарону айчыннай эканомікі ад замежнай канкурэнцыі [1, с. 127]. Пратэкцыянізм спрыяе развіццю ў краіне пэўных галін вытворчасці. Аднак занадта доўгае прымяненне гэтай палітыкі можа прывесці і прыводзіць да эканамічнага застою, таму што, калі ліквідаваць замежную канкурэнцыю, паслабляецца зацікаўленасць айчынных прадпрымальнікаў у павышэнні тэхнічнага ўзроўню і эфектыўнасці вытворчасці.

У міжнародным гандлі атрымлівае перавагу той, хто можа прапанаваць рынку тавар лепшай якасці па больш нізкай цане. У сувязі з гэтым узнікаюць гандлёвыя канфлікты – саперніцтва паміж некалькімі суб'ектамі эканомікі ці дзяржавамі з мэтай захопу новых рынкаў збыту або абароны ўжо наяўнай долі рынку. Гандлёвыя канфлікты ўзнікаюць паміж краінай і групоўкай краін, унутры групоўкі краін, паміж асобнымі краінамі, паміж групоўкамі краін. Гандлёвыя канфлікты аказваюць істотнае ўздзеянне на прыняцце гандлёва-палітычных рашэнняў і ў значнай меры вызначаюць прынцыпы і асаблівасці механізмаў і практыкі выкарыстання інструментаў знешнегандлёвай палітыкі. Гандлёвыя канфлікты могуць выклікацца як эканамічнымі, так і палітычнымі прычынамі. У сучаснай эканоміцы вылучаюць 3 асноўныя прычыны гандлёвых канфліктаў. Гэта «барацьба за ўладу», сродак выхаду з крызісу і мера ў адказ на жорсткую гандлёвую палітыку.

Так, напрыклад, Турцыя ўвяла з 2018 года імпартныя квоты на розныя вырабы са сталі ў мэтах абароны ўласных вытворцаў, што парадзіла гандлёвы канфлікт паміж Турцыяй і ЕС. Прычынамі самага значнага канфлікта ў сучасны час паміж дзюма сусветнымі эканомікамі паміж ЗША і Кітаем з’яўляюцца жаданне знізіць паток імпартных тавараў з Кітая, нізкая абарона інтэлектуальнай уласнасці, імкненне Трампа атрымаць падтрымку выбаршчыкаў на выбарах 2020 года. Прыкладамі найбуйнейшых гандлёвых войнаў могуць служыць «бананавая вайна» паміж ЗША і ЕС, «вінная вайна» паміж Малдовай і Грузіяй у 2006 г., «малочная вайна» 2009 года паміж Беларуссю і Расіяй.

Ва ўмовах сучасных гандлёвых канфліктаў набывае асаблівую важнасць пытанне забеспячэння адэкватнай абароны дзяржаў-членаў Еўразійскага эканамічнага саюза і іх суб'ектаў гаспадарання. У Рэспубліцы Беларусь і ў ЕАЭС сфарміравана сістэма рэгулявання знешнеэканамічнай дзейнасці, якая дазволіла абагульніць практыку ў гэтай галіне і, з улікам сусветнага вопыту, падрыхтаваць неабходныя прававыя акты, што рэгламентуюць знешнегандлёвую дзейнасць.

Падчас даследавання ўстаноўлена, што ў ЕАЭС ва ўмовах правядзення адзінай знешнегандлёвай палітыкі, на наднацыянальным узроўні забяспечана абарона ад імпарту, аднак члены ЕАЭС не маюць магчымасці сумесна супрацьстаяць наступствам гандлёвых канфліктаў, паколькі няма агульнай экспартнай стратэгіі (палітыкі) членаў ЕАЭС, не створаны механізм рэгулявання доступу тавараў на рынкі трэціх краін, які эфектыўна працуе. Нягледзячы на наяўныя, хоць і абмежаваныя паўнамоцтвы, дзейнасць па паляпшэнні доступу тавараў на рынкі трэціх краін Еўразійскай эканамічнай камісіі не з'яўляецца прыярытэтнай.

Пры гэтым варта ўлічваць, што ЕАЭС як міжнародная арганізацыя не з'яўляецца членам СГА і іншых міжнародных арганізацый, таму не можа ў поўнай меры абараняць знешнегандлёвыя інтарэсы партнёраў па еўразійскай інтэграцыі. Самастойнае адстойванне дзяржавамі-членамі ЕАЭС сваіх інтарэсаў у міжнародных інстанцыях таксама звязана з неабходнасцю ўзгаднення пазіцый адзін з адным. Эфектыўнага механізму такога ўзгаднення няма. Такім чынам, актуальным з'яўляецца пытанне яго распрацоўкі.

У СГА існуе свой унікальны працэс ўрэгулявання гандлёвых спрэчак, які ажыццяўляецца ў пяць этапаў: кансультацыі, абмеркаванне ў групе, апеляцыйны працэс, вынясенне рашэння і кантроль выканання. Даследаваўшы асноўныя рысы механізму вырашэння канфліктаў у рамках СГА, можна адзначыць, што механізм, прадугледжаны Дамоўленасцю аб правілах і працэдурах уладжвання спрэчак, з'яўляецца выключна публічна-прававым. Мэта механізму ўрэгулявання канфліктаў заключаецца не ў тым, каб вынесці тое ці іншае «судовае» рашэнне, а ў тым, каб урэгуляваць канфлікт. Аднак механізм выканання рэкамендацый і рашэнняў СГА з'яўляецца неэфектыўным з прычыны адсутнасці мер прымусу стараны СГА ў дачыненні да дзяржавы, якая не выконвае рэкамендацыі і рашэнні.

Орган уладжвання спрэчак СГА валодае найбольшым аўтарытэтам у галіне разгляду міжнародных гандлёвых спрэчак і дастатковымі інтэлектуальнымі рэсурсамі: членамі трацейскіх груп, як правіла, з'яўляюцца найбуйнейшыя ў свеце спецыялісты ў галіне міжнароднага

гандлёвага права. Аднак для падтрымання парадку ў галіне міжнароднага гандлю Орган уладжвання спрэчак СГА павінен удасканальвацца. У распачатым працэсе мадэрнізацыі абазначылася важнае пытанне, якое патрабуе неадкладнага вырашэння – гэта мадэрнізацыя Апеляцыйнай інстанцыі Органа ўладжвання спрэчак, бо адсутнасць рашэння дадзенага пытання можа нанесці сур'ёзны ўрон найважнейшай функцыі СГА – вырашэнню гандлёвых канфліктаў.

Такім чынам, знешнегандлёвая палітыка па сваёй сутнасці канфліктная. Прычынамі сучасных гандлёвых канфліктаў з’яўляюцца «барацьба за ўладу», неабходнасць выхаду з крызісу і адказ на жорсткую гандлёвую палітыку. Пры ўладжванні гандлёвых канфліктаў паміж рознымі дзяржавамі выкарыстоўваюцца інструменты знешнегандлёвай палітыкі. На нашу думку, аднымі з прыярытэтных напрамкаў развіцця ЕАЭС з’яўляюцца правядзенне работы па фарміраванні адзінай экспартнай стратэгіі (палітыкі) ЕАЭС, атрыманне статусу назіральніка ў СГА, а пасля ўступлення Беларусі ў СГА – далучэнне да гэтай міжнароднай арганізацыі. Каб пазбегнуць глабальнай гандлёвай вайны, неабходна хутчэй вырашаць пытанне па ўдасканаленню Органа ўладжвання спрэчак СГА і ў цэлым па рэфармаванню механізму ўладжвання канфліктаў. У іншым выпадку Орган уладжвання спрэчак не зможа працягнуць сваю працу, а правілы, што выпрацаваны ў рамках многабаковай гандлёвай сістэмы таксама працаваць не будуць, што прывядзе да сур’ёзных сутыкненняў сусветных эканамічных інтарэсаў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Балакина, А. П.* Экономика: учебник для вузов / А.П. Балакина, И.П. Бабленкова. – Москва: Дашков и К, 2015. – 315 с.
2. Договоренность о правилах и процедурах, регулирующих разрешение споров. URL: https://base.garant.ru/2541158/f7ee959fd36b5699076b35abf4f52c5c/ (дата звароту: 27.03.2020).
3. *Задоя, А. А.* Макроэкономика: учебник / А.А. Задоя, Е.Ю. Петруня. – Киев: Знания, 2006. – 368 с.
4. *Мытарева, Е. А.* Роль «торговых войн» в мировой экономике / Е.А Мытарева // Мировая экономика и социум: от кризиса до кризиса. Ч. 2. – Саратов: Наука, 2009. – С. 254.
5. Правила ВТО и основы торговой политики. – Москва: Международные отношения, 2017. – 624 с.

6.*Ястреб, Т. А.* Влияние политики протекционизма на международную торговлю государств-членов ЕАЭС: правовой аспект / Т.А. Ястреб, Е.А. Вакорина // III Сибирские Правовые Чтения: сборник научных статей / [отв. ред. В.И. Осейчук]; Министерство науки и высшего образования Российской Федерации, Тюменский государственный университет, Институт государства и права. – Тюмень: Издательство Тюменского государственного университета, 2019. – 316 с. – С. 270 – 273.